# ІНВЕНТАРНЫЯ КНІГІ БЕЛАРУСКАГА МУЗЕЯ ІМЯ І. ЛУЦКЕВІЧА Ў ВІЛЬНІ

***В. С. Іванова***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, ivanovavs@bsu.by*

Беларускі музей імя І. Луцкевіча ў Вільні (1921–1945) з’яўляўся цэнтрам збірання прадметаў кніг, рукапісаў, асабістых архіваў і архіваў арганізацый, якія адлюстроўваюць гісторыю і культуру Беларусі. Доўгі час асноўныя інвентарныя кнігі прадметаў музея не былі вядомыя ў навуковай літаратуры, што не давала магчымасці комплекснай ацэнкі яго збораў і правядзення навуковай рэканструкцыі. У прадстаўленай публікацыі даецца характарыстыка трох асноўных інвентарных кніг, а таксама пералік усіх выяўленных інвентарных кніг і каталогаў музея, агульнай колькасцю каля двух дзясяткаў.

***Ключавыя словы:*** музей; інвентарная кніга; каталог; апісанне; архіў.

# ИНВЕНТАРНЫЕ КНИГИ БЕЛАРУСКОГО МУЗЕЯ ИМЕНИ И. ЛУЦКЕВИЧА В ВИЛЬНА

***О. С. Иванова***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, ivanovavs@bsu.by*

Беларуский музей имени И. Луцкевича в Вильно (1921–1945) являлся центром собирания предметов книг, рукописей, личных архивов и архивов организаций, отражающих историю и культуру Беларуси. Долгое время основные инвентарные книги предметов музея не были известны в научной литературе, что не давало возможности комплексной оценки его собраний и проведения научной реконструкции. В представленной публикации дается характеристика трех основных инвентарных книг, а также перечень всех выявленных инвентарных книг и каталогов музея, общей численностью около двух десятков.

***Ключевые слова***: музей; инвентарная книга; каталог; описание; архив.

# INVENTORY BOOKS OF THE BELARUSIAN MUSEUM OF I. LUTSKEVICH IN VILNIA

***V. S. Ivanova***

*Belarusian State University,*
*Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, ivanovavs@bsu.by*

The Belarusian Museum of I. Lutskevich in Vilnia (1921–1945) was a center for collecting objects, books, manuscripts, personal archives and archives of organizations, that reflected the history and culture of Belarus. For a long time, the main inventory books of the museum's objects were not known in the scientific literature, which did not allow for a comprehensive assessment of its collections and scientific reconstruction. The presented publication describes the three main inventory books, as well as a list of all identified inventory books and catalogues of the museum. Total amount of them is about two dozen.

***Keywords:*** inventory books; museum; archives; catalogs; description.

Доўгі час у гістарыяграфіі панавала думка аб тым, што інвентарызацыя збораў Беларускага музею імя І. Луцкевіча ў Вільні (1921–1945) (далей – Музей) была недасканалай і фрагментарнай, што прыводзіла да немагчымасці іх колькаснай і якаснай ацэнкі. Найноўшыя даследаванні абвяргаюць гэты тэзіс [1], а апошнія знаходкі кажуць аб вельмі пільнай увазе супрацоўнікаў Музею да інвентарызацыі і справаводства, асабліва пасля яго перадачы ў склад літоўскіх дзяржаўных установ: 18 снежня 1940 г. – Інстытута Літуаністыкі Літоўскай акадэміі навук, а 1 лютага 1942 г. – Дэпартамента навукі і мастацтва пры Міністэрстве асветы. Значным фактарам, які паўплываў на якасць інвентарызацыі збораў быў таксама прыход на працу ў Музей ў снежні 1941 г. мастацтвазнаўцы Уладаса Дрэмы. Сёння можна казаць, што у Беларускім музеі імя І. Луцкевіча ў Вільні вялося больш за паўтары дзясяткі розных каталогаў, інвентарных кніг і вопісаў. Рабіліся яны ў розныя часы, рознымі асобамі і апісвалі розныя часткі збораў Музея (Дадатак 1 і 2).

Асноўная праблема, якая перашкаджала комплекснай ацэнцы збораў – гэта раскіданасць інвентарных кніг і справаводства Музею па шэрагу сховішчаў, гэтаксама як і саміх збораў. На працягу 1944–1946 гг. можна вылучыць некалькі буйных перадач з Музея ў дзяржаўныя сховішчы Літвы і Беларусі:

15–16 жніўня 1944 г. – 1066 адз. зах. з архіваў беларускіх арганізацый перададзеныя ў Літоўскі цэнтральны дзяржаўны архіў (LCVA);

18 мая 1945 г. – каля 800 прадметаў (карцін, скульптур, ікон) – у Віленскі дзяржаўны мастацкі інстытут (цяпер Літоўскі нацыянальны мастацкі музей (LNDM) [2].

1 жніўня 1945 г. – 12. 125 экспанатаў (у т. л. пергаміны і фотаздымкі), 243 кнігі і 160 аб’ектаў інвентара Музея (шафы, сталы, канцылярскія прылады) – у Віленскі этнаграфічны музей Літвы (цяпер Літоўскі нацыянальны музей (LNM); 20 тыс. кніг – у Бібліятэку Акадэміі навук ЛССР (Бібліятэка акадэміі навук Літвы імя Урублеўскіх (LMAVB); 35 тамоў фальклорных запісаў – у фальклорны і музычны архіў Акадэміі навук ЛССР (цяпер Літоўскі інстытут літаратуры і фальклору (LTR) [3];

8 жніўня 1945 г. – 8040 апісаных, 2,5 тыс. неапісаных экспанатаў, 41 546 кніг, карт, брашур і перыядычных выданняў – у Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (БДМВАВ) [4];

12 студзеня 1946 г. – 4618 адзінак рукапісаў, старажытных грамат, рукапісных кніг, старадрукаў, фотаздымкаў і інш. – у Бібліятэку Акадэміі навук ЛССР (LMAVB).

Падчас падзелу Музея інвентарныя кнігі і вопісы перадаваліся разам з профільнымі зборамі: інвентарныя кнігі прадметаў – у музей (LNM), каталогі старадрукаў, кніг і рукапісаў – у бібліятэку (цяпер F21 (Віленскі беларускі фонд) LMAVB). Што тычыцца іншых перадач – у LCVA, Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў (LVIA), Нацынальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ), Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ), Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў (БДАКФФД) і інш., – то тут часта адсутнічала комплекснае анатаванне і не было магчымасці абапірацца на зыходныя апісанні. Нягледзячы на тое, што супрацоўнікі гэтых установ рабілі пэўныя высілкі для ідэнтыфікацыі збораў, – вынік быў мінімальны, як для разумення значнасці збораў агулам, так і для апісання канкрэтных прадметаў. Так, напачатку 1953 г. у Цэнтральны дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў (ЦДАКФФД) БССР было перададзена 50 фотаздымкаў са збораў Музея ў БДМГВАВ [5]. У 1956 г. супрацоўнікі архіва звярнуліся ў Саюз пісьменнікаў Літвы з просьбай аб дапамозе ў ідэнтыфікацыі [6]. І толькі ў 1958 г. супрацоўнік архіва быў накіраваны ў камандзіроўку ў Вільню, «*дзе атрымалася з вялікай цяжкасцю адшукаць інвентарныя кнігі музея Луцкевіча ў цяперашнім краязнаўчым музеі г. Вільня і ўсталяваць па іх анатацыі адпаведных фотапазітываў*» [7]. Гаворка тут ішла пра тагачасны Віленскі гісторыка-этнаграфічны музей ЛССР (цяпер LNM), куды кнігі паступілі разам са зборамі ў 1945 г. і захоўваюцца там да сённяшняга часу. Менавіта яны і яшчэ адна, першая па часе стварэння, інвентарная кніга прадметаў Музею, будуць разглядацца ў межах дадзенай публікацыі.

3 чэрвеня 1922 г. Антонам Луцкевічам, дырэктарам Музея, была распачата першая інвентарная кніга. Да 1939 г. апісанне прадметаў Музея ажыццяўлялася дастаткова павольна. Антонам Луцкевічам агулам было заінвентарызавана каля 2 тыс. прадметаў. З 3 лістапада 1939 г. ў Музеі пачаў працаваць мастак Пётра Сергіевіч[1]. Ён працягнуў вядзенне інвентарнай кнігі: правёў апісанне некаторых археалагічных прадметаў (с. 92–93), клішэ[2] (с. 128–129), малюнкаў Я. Драздовіча, А. Мальчэўскага, М. Кулешы і інш. (лл. 225–242) – усяго каля двухсот прадметаў. На с. 208 запісы №№ 106–110 зробленыя рукой У. Дрэмы. Гэтую кнігу, якая сёння захоўваецца ў

[1] Ён працаваў да чэрвеня 1941 г., а потым з 3 ліпеня 1944 па кастрычнік 1945.

[2] Напрыклад, л. 129, № О-94 ці № 1977 – падвойная дзеравянае кліше: 1. Маці Божая з Хрыстом. Па бакох свсв. Язэп і Яхім. У гарэ надпіс: «Oboz Mariey Włosozowskiej«, і ўнізе напіс-песня: Zavitaj Panienka… 2. Свь. Міхал у аднэй руцэ трымае меч, у другой вагі. Стаіць на пакацанай зміі з чалавечай галавой. У гары напіс: Sanetus Michael. Унізе лацінскі напіс. Велічыня клішы 29х38 см.

БДАМЛМ, можна ўмоўна назваць інвентарная кніга № 1 Луцкевіча (ІКЛ-1) [8].

У ІКЛ-1 было 4 асноўных графы: інвентарны нумар прадмета ў межах раздзела, што ўносіўся пры паступленні, нумар пераінвентарызацыі, апісанне прадмету (назва, кароткае апісанне, памеры, часам замалёўкі) і ад каго і калі паступіла. Усяго ў ІКЛ-1 згодна агульнаму зместу, зробленаму Антонам Луцкевічам, па ўсіх раздзелах было ўнесена агулам 2608 прадметаў. У самой кнізе валавая нумарацыя, што рабілася ўжо пры пераінвентарызацыі, ўключае і №№ 2432 (л. 251) плюс 435 адзінак раздзела W. Кафлі і цэгла (л. 257–261) (усяго 2867). Таму дакладную лічбу колькасці заінвентарызаваных прадметаў ў ІКЛ-1, пазначыць дастаткова складана. Але за аснову ў межах данага даследавання будзе ўзята колькасць пазначаная ў змесце (2608).

Кніга падзеленая на 22 раздзелы: персцянёў, крыжоў і абразкоў з медзі, святых абразкоў, абразкоў на мэталю і воты, клямраў, бляхаў і аздобаў да конскае збруі, клямраў і аздобаў, гузікаў і засцёжак да адзежы, прыладаў да мукаў, пячаткаў, дагістарычных выкапняў, мэблі і хатніх рэчаў, разьбы з дрэва, гравёрскіх блёкаў, вопраткі, тканіны, царкоўных апаратаў і аружжя, судзьдзя (медзі, цыпы, гліны, шкла, фаянсу), малярства, фальклёру, ручных рысункаў у папках, зброі, кафлі і цэглы, дрэварытаў, харугваў, графікі. Прадметы ўносіліся ў кожны раздзел па ступені паступлення, хаця логіка падзелу ІКЛ-1 дастаткова складаная і блытаная.

Паралельна вёўся карткавы каталог прадметаў (ПК) па асобных раздзелах [9]. Знойдзеныя раздзелы каталога: О-гравюры і карціны ў колькасці 89 адзінак (у ІКЛ-1 – 94 адзінкі), R-судзьдзе (медзь, цыпа, гліна, шкло, фаянс) – 83 адз. (у ІКЛ-1 – 89), Р-вопратка, тканіны, царкоўныя апараты – 55 (у ІКЛ-1 – 126), Т-фальклор – 68 адз. (у ІКЛ-1 – 106). Каталог, як бачым выглядае даволі фрагментарна ў параўнанні з ІКЛ-1, якая доўгі час была асноўнай уліковай кнігай Музея.

З гэтай жа прычыны – недасканаласці апісанняў і сістэматызацыі ў Музеі, – імаверна, у другой палове – канцы 1930-х гг. Антон Луцкевіч пачаў пераінвентарызацыю, якая працягвалася да 1944 г. На першай старонцы першай з новых інвентарных кніг ёсць запіс Уладаса Дрэмы: «№№ 1–414 запісаў Антон Луцкевіч, №№ 415–1977 – Пётра Сергіевіч, а №№ 1978–4978 – Уладас Дрэма». На гэты ж запіс абапіраецца ў сваіх успамінах і Я. Шутовіч, кажучы, што Луцкевічам і Сергіевічам было заінвентарызавана 1977 адзінак [10]. Абедзьве кнігі напісаныя друкаванымі літарамі, таму адрозніць почыркі дастаткова складана. Але на с. 38 ёсць каментар да

прадмета № 268 – бюста гр. Плятара працы Антакольскага, зроблены пісьмовым почыркам Антона Луцкевіча, наступнага зместу: «*Перад выездам з Вільні ў Варшаву як забесьпячэнне недаплачанае належнасьці Луцкевічу ў суме 57 злот. Ант. Луцкевіч*».

З 1 снежня 1941 г. у Музеі пачаў працу мастацтвазнаўства Уладас Дрэма: «*Да 1 снежня 1941 г. я працаваў у музеі Віленскага ўніверсітэта*[1]*, калі мяне запрасіў дырэктар музея Я. Шутовіч. У гэтай установе, хоць заработная плата была невысокай, новыя ўмовы дазвалялі працаваць у любімай навукова-даследчай і музейнай справе, дзе я мог абнавіць сваю працу ў галіне гісторыі Літоўскага мастацтва. У гэтай установе, якая тады належала сістэме Літоўскай акадэміі навук, я працаваў на працягу ўсяго перыяду нямецкай акупацыі: парадкаваў музейныя фонды, навуковыя супрацоўнікі іх інвентарызавалі і рыхтавалі экспазіцыі*» [11]. Як адзначаў Янка Шутовіч: «*Уладас Дрэма з вялікай любоўю прадмета і з прафесійнай самаахвярнай аддачай сваіх сіл не агранічыўся пры каталагізаванні да сухога апісання экспанатаў*» [12]. Янка Шутовіч таксама сведчыў аб тым, што Дрэмай былі зробленыя запісы ў першым томе новай інвентарнай кнігі з № 1978 да № 4978, а ў другім з № 4979 да № 9421. Усяго ён апрацаваў 7 442 пазіцый з агульнага ліку заінвентарызаваных. Таму ўмоўна іх можна назваць інвентарнымі кнігамі Дрэмы (ІКД-1, ІКД-2).

У гэтых інвентарных кнігах была зробленая новая валавая нумарацыя, апісанні, а таксама замалёўкі шэрагу прадметаў. Форма для іх была надрукаваная тыпаграфскім спосабам на беларускай мове. Кожная са старонак пранумаравана чатырохзначнай друкаванай лічбай на адвароце (т. ч. рабілася нумарацыя разварота цалкам). Тут маюцца наступныя графы: № інв. (валавая нумарацыя ўсіх прадметаў), № нат. (нумарацыя па радзелах ІКЛ-1), род (назва прадмета), памеры, вага, матар'ял, з якога часу (гістарычны перыяд), калі прынята, ад каго прынята, як набыта (дар, дэпазыт ці інш. ), апісанне (разгорнутае апісанне і замалёўкі), увагі. Першым у кнігу быў унесены археалагічны (ці дагістарычны) раздзел (літара К ў ІКЛ-1). У ІКД-1 звычайна бачым больш разгорнутыя і поўныя апісанні з дадатковымі звесткамі, але ёсць і адваротныя прыклады (гл. запіс N-64):

[1] Мар'ян Пецюкевіч у сваіх успамінах піша, што У. Дрэма быў прыняты на працу ў Музей яшчэ падчас яго дырэктарства з канца 1940 г. Але, па штатным раскладзе ад 18. 01. 1941 ў Музеі працавалі: П. Сергіевіч, В. Дыра, В. Александровіч. З. Андрэеева (LCVA. Ф. 1001. Воп. 1. Адз. зах. 26. Л. 16); ад 09. 04. 1941 – Янка Шутовіч, Пётра Сергіевіч, Янка Бекіш, Віктар Дыра, Зінаіда Андрэева (LCVA. Ф. 1001. Воп. 1. Адз. зах. 26. Л. 46).

*Табліца 1*

**Форма ІКЛ-1, запісы N-64, К-151**

| № п/п | № пераінв. | Апісанне | Адкуль паступіла[1] |
|---|---|---|---|
| 64 | 271 | Група: два краўцы, адзін заснуў, другі йшчэ працуе пры агарку сьвечкі. Работ Крэменя (гіпс) – дэпозыт Ант. Луцкевіча. Крэмень[2] – жыдоўскі хлопец з мяст. Жалудка Лідскага пав. (закрэслена Пасадзец, Ашмянскі пав.) – зьвярнуўся ў 1913 г. да Луцкевічоў з сваімі скульптурнымі работамі як самавук. Луцкевічы заінтэрэсавалі лёсам здольнага хлопца грамадзянства (д-ра Выгодзкага, д-ра Шабада і інш.) і для Крэменя сабралі грошы на выезд у Парыж. У Парыжу над той час жыў адзін з сыноў д-ра Георга Ромма, каторы заапекаваўся маладым мастаком і дапамог яму устроіцца. Апекаваўся ім такжа Марк Шагаль. Крэмень пакінуў Луцкевічам дзьве свае працы з гліны. Адна рассыпалася, а другую – на кошт А. Луцкевіча адліў у гіпсе Арлоўскі (у 1923 годзе) | |
| 151 | + | Каробка з кускамі гаршэчкаў і глінянай бусай; знойдзены ў культурным пласьце зямлі на "Копнай гары" каля мяст. Краснага, Вялейскага пав. за чыгункай (між ст. Уша і дваром Сьніткі) Ів. Луцкевічам у 1904 г. | |

*Табліца 2*

**Форма ІКД-1, запіс 151, 271**

| № інв | № нат | Род | Памеры, вага | Матар'ял | З якога часу | Калі прынята | Ад каго прынята | Як набыта | Апісанне | Увагі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 151 | К-151 | Прасьлічка і абломкі гаршкоў | вонк ⌀ 36мм, ун ⌀ 9, грубіня 11 | гліна | дагіст | 1918 | Знойдзены на гарадзішчы каля Краснага паміж дваром Сьніткі і ст. Уша Ів. Луцкевічам ў 1904 г. (пав даўней Вілейскі, цяпер Маладэчанскі) | | Праслічка з жоўтае гліны. Адна падстава плоская, пакрытая дзірачкамі. Уся плошча боку аздобена папярэчнымі рыскамі. Верхняя падстава выпуклая - падобная да стажка. На чарапкох з падобнае гліны відаць сляды аплятання (саломай?). На адным краю плоскага верху гары на прылеглым склоне яе і ніжэй пад ёй знойдзена шмат вугалльля. Ів. Луцкевіч называў гару гэную "Копнай гарой" | AR 372 |

[1] У кнізе выкарыстоўваўваліся друкарскія графы на рускай мове, якія не адпавядалі зместу. Тут пададзеныя назвы згодна зместу графаў.

[2] Пінхус Крэмень (1890, Жалудок – 1981, Францыя) – французскі мастак Парыжскай школы беларускага паходжання. Акрамя жывапісу, займаўся таксама скульптурай і графікай.

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 271 | N-64 | скульп-тура (група) | | гіпс | XX | 1923 | Ад А. Луцкевіча | дар | Два краўцы: стары заснуў на лаўцы, маладзейшы йшчэ працуе пры дагараючай сьвечцы. Работа Крэменя з м. Пасадзец, Ашмянск. пав. у 1913 г. | |

У ІКД-1 раздзел N-разьбы, пачынаецца з валавага № 206; S-малярства – з 359; P-вопраткі – з 695; O-гравёрскіх блёкаў – з 846; A-персцянёў – з 1046; D-абразкоў – з 1122; Z-графікі – з 1182; I-пячатак – з 1484; U-малюнкаў – з 1661; E-клямраў – з 1849; F-клямраў –1885; G– з 1911; H-прылад да мукаў – 1923; M-мэблі – з 1926; R-суддзья – з 1978, T – з 2176, V – з 2304. У кожны з раздзелаў дадаваліся новыя апісанні, якіх не было ў ІКЛ-1. Часам раздзелы перарываюцца і пачынаюцца нанова ўперамешку. З № 3431 – прадметы не маюць нумарацыі па раздзелах – толькі валавую. З № 4226 пачынаецца вялікі раздзел апісання паштовак, фотаздымкаў, візітовак, запрашэнняў («пісулак на паперы»). Яны ж (значная частка – гэта ахвяраванні Ю. Дубейкаўскай) працягваюць ІКД-2 [13] да нумару 5519. Далей да ідуць малюнкі, літаграфіі А. Ярмалковіча і інш., скрынкі Я. Драздовіча, фотаздымкі, тканін, керамікі з замалёўкамі. З 6643–7985 – вялікі блок фотаздымкаў, далей пломбы, туфлі, пячаткі (№№ 8049–8318), гаршкі, і зноў паштоўкі, кафля, тканіны і інш. Сустракаецца і нумарацыя па раздзелах з ІКЛ-1. На апошняй старонцы зроблены змест па раздзелах: пісулькі, малюнкі, вопратка, кераміка, археалогія, рысункі, мэбля, графіка, фотаграфія. Апошні – самы вялікі

Пасля пераінвентарызацыі ІКЛ-1 і каталогі прадметаў ужо не разглядаліся як асноўная ўліковая дакументацыя Музея, магчыма таму засталася ў асабістых архівах Янкі Шутовіча і Пятра Сергіевіча, а інвентарныя кнігі Дрэмы былі перададзеныя ў LNM разам з асноўнымі зборамі. ІКЛ-1 ад Сергіевіча патрапіла да беларускага мастака і графіка Яўгена Куліка і ў складзе яго асабістага фонда ў 2012 г. паступіла на захоўванне ў БДАМЛМ. Фонд быў апрацаваны і стаў даступны для карыстальнікаў у 2019 г. Але яшчэ ў 1995 г., ІКЛ-1 была апублікаваная на старонках часопіса спадчына мастаком, сябрам Я. Куліка – У. Крукоўскім [14]. У публікацыі захаваная мова, інвентарныя нумары па раздзелах, аднак апушчаныя рознага кшталту пазнакі і прыпіскі, а самае важнае – гэта валавая нумарацыя, нададзеная прадметам пасля перасістэматызацыі. Менавіта пад гэтымі нумарамі прадметы паступалі на захоўванне ў

дзяржаўныя сховішчы: напрыклад, на паштоўках яны былі прастаўленыя друкаваным спосабам. Гэтаксама нумараваліся і старонкі ІКД-1 і ІКД-2. Апошнія, трэба меркаваць, былі вядомыя асобным супрацоўнікам літоўскіх і беларускіх музеяў, архіваў і бібліятэк, якія працавалі над апісаннямі збораў былога Музея, гэтаксама як і Янку Шутовічу, які ў сваіх успамінах дакладна называе месца іх захоўвання і дае іх даволі падрабязнае апісанне (Дадатак 1). Аднак для шырокай навуковай грамадскасці яны застаюцца амаль невядомымі на сённяшняга часу.

Апісаныя інвентарныя кнігі маюць не толькі інфармацыйную каштоўнасць, і значнасць для рэканструкцыі паўнаты складу і ідэнтыфікацыі асобных прадметаў Музея, але і гісторыка-культурную, мастацтвазнаўчую, мовазнаўчую каштоўнасць, бо даволі падрабязна апісваюць пэўныя з’явы і маюць шэраг замалёвак. І ў гэтым сэнсе безумоўна павінны стаць здабыткам для шырокага кола навукоўцаў. Што тычыцца пытання навуковай рэканструкцыі самаго Музея, то тут інвентарныя кнігі з’яўляюцца фундаментам, без якога яна ў прынцыпе немагчымая, але іх публікацыя больш мэтазгодная ў выглядзе электроннага рэсурса з магчымасцю пошука па зададзеных параметрах – нумару, віду, уладальніку і віду ахвяравання, даце паступлення і інш. Кнігі ІКЛ-1 і ІКД-1, ІКД-2 ў пэўным сэнсе дапаўняюць адна адну, што таксама варта ўлічваць пры далейшай працы і комплекснай археаграфічнай публікацыі.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Іванова В. Гістарыяграфія і крыніцы гісторыі Беларускага музея імя Івана Луцкевіча ў Вільні // Аўтограф / Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. Вып.3. Мн., 2022. С. 114–122.

2. LCVA. Ф. 1016. Воп. 1. Адз. зах. 13. Арк. 1–4. Справаздача дырэктара Віленскага дзяржаўнага мастацкага інстытута Вітаўтаса Юркунаса аб адборы экспанатаў. Літ. м. 22. 05. 1945.

3. LCVA. Ф. 1001. Воп. 2. Адз.зах. 20. Арк. 7. Акт прыёма-перадачы экспанатаў, архіва і бібліятэкі Музея ў АН ЛССР. Літ.м. 01.08.1945.

4. LCVA. Ф. 1001. Воп. 2. Адз. зах. 20. Арк. 7. Акт прыёма-перадачы экспанатаў, архіва і бібліятэкі Музея ў АН ЛССР. Літ. м. 01. 08. 1945.

5. LMMA. Ф. 476. Воп. 1. Адз. зах. 9. Л. 168. Праект акта перадачы маёмасці Беларускага музея імя І. Луцкевіча ў Вільні ў БССР. Рус. м. 1945.

6. НАРБ. Ф. 249. Воп. 5. Адз. зах. 390. Ліст кіраўніка ЦДАФФКД выконваючаму абавязкі кіраўніка Архіўнага упраўлення МУС БССР з просьбай аб дазволе прыняць фотаздымкі з БДМВАВ. 26. 01. 1953. Рус. м.

7. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (АРКР ЦНБ НАН Беларусі). Ф. 1. Воп. 1. Адз. зах. 108. Л. 45. Ліст дырэктара ЦДАКФФД ў Саюз пісьменнікаў ЛССР з просьбай аб дапамозе ў ідэнтыфікацыі фотаздымкаў Музея. 03. 10. 1956. Рус. м.

8. НАРБ. Ф. 249. Воп. 5. Адз. зах. 680. Л. 18. Дакладная запіска супрацоўніка архіва кінафотафонадакументаў у Вільнюс па пытанні усталявання фондавай прыналежнасці перададзеных фотаздымкаў [1958].

9. Інвентарная кніга № 1 прадметаў Музея №№ 1–[2608]. Складзена Антонам Луцкевічам і Пётрай Сергіевічам. З пазнакамі і нумарацыяй У. Дрэмы. 1922–[1941] (ІКЛ-1) // БДАМЛМ. Ф. 518. Воп. 1. Адз. зах. 1128. 278 л.

10. АРКР ЦНБ НАН. Ф. 23. Воп. 1. Адз. зах. 560. 206 л. Карткавы каталог прадметаў; Ф. 23. Воп. 1. Адз. зах. 558. 186 л. Карткавы каталог гравюр.

11. АРКР ЦНБ НАН. Ф. 1. Воп. 1. Адз. зах. 60. Арк. 47. Успаміны Янкі Шутовіча.

12. Drėma Vladas. Autobiografija. Sausio 26 d. 1955 m. Publikaciją parengė Ingrida Pajedaitė // Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka. 2011, 2007/208, p. 106–120.

13. АРКР ЦНБ НАН. Ф. 1.

14. Інвентар Беларускага Музэю ім. Івана Луцкевіча. ІІ. 4979–9421. Складзена Уладасам Дрэмай. (ІКД-2) // Архіў LNM. Воп. 3. Адз. зах. 26. 405 л.

15. Інвентарная кніга Музэю ім. Ів. Луцкевіча Беларускага Навуковага Таварыства ў Вільні № 1: пач. 3 чэрв. 1922 г. / тэкст кн. падрыхт. да публ. У. Крукоўскі // Спадчына. 1995. № 1. С. 47–51; № 2. С. 85–111; № 3. С. 138–156; № 4. С. 60–79; № 5. С. 163–190.

## Дадатак 1. З успамінаў Янкі Шутовіча аб інвентарных кнігах Музея.

…Нягледзячы на цяжкія ўмовы для працы, праца гэта даволі інтэнсіўна і эфектыўна вялася. Доказам гэтага – шчасліва захаваныя інвентарныя кнігі музею, якія сёння знаходзяцца ў Гісторыка-этнаграфічным музеі Акадэміі навук Літоўскай ССР[1].

Іх – дзве кнігі (тамы). Першая кніга мае запісаных інвентарных пазіцыяў – 4. 978, а усяго ў ёй запісаных і апісаных экспанатаў – 6. 422; у другой кнізе – апрацаваных і запісаных пазіцыяў ад № 4. 979 да № 9. 421. Усяго ў дзвюх кніжках з'інвентарызаваных пазіцыяў 9. 421. Часамі ў адну інвентарную пазіцыю ўваходзілі аж некалькі апісаных экспанатаў, і таму паводле інвентарных кніг, лік экспанатаў значна перавышае лік інвентарных пазіцыяў. Гэта бачым ўжо з першай інвентарнай кнігі: у ей запісаных інвентарных пазіцыяў – 4. 978, а запісаных і апісаных экспанатаў – 6. 422. Запісы рабілі ў перадваенным перыядзе дырэктар музею Антон Луцкевіч і мастак Пётра Сергіевіч, у ваенным перыядзе – мастак-графік і гісторык мастацтва Уладас Дрэма (літовец, добра валодаючы беларускай мовай). Трэба прыняць вялікія заслугі В. Дрэмы перад беларускім музеем. Ён з вялікай самааддачай прафесійных сіл і з любоўю прадмета парадкаваў скарбы музею. Ён не толькі проста запісваў у інвентарных кнігах экспанаты, але важнейшыя і найкаштоўнейшыя з іх – а іх велізарная колькасць – падаваў ў малюнках. Рабілася гэта дзеля таго, каб на выпадак знішчэння або пакражы экспанатаў можна было на падставе інвентарнай кнігі мець канкрэтнае ўяўленне пра іх. Ён болей за сваіх папярэднікаў з'інвентарызаваў экспанатаў: з агульнага ліку ў дзвюх кнігах 9. 421 пазіцыі апрацаваў 7. 442. За гэта яму належыць шчырая падзяка і прызнанне. Інвентарныя пазіцыі ўспомненых кніг ахаплялі толькі экспанаты, што датычылі гістарычнага быту, мастацтва, археалогіі, этнаграфіі, паліграфіі, мілітарыяў.

Для экспанатаў з аддзела сфрагістыкі[2], нумізматыкі, музычна-песеннага і інш. былі заведзеныя асобныя інвентарныя кнігі і каталогі; таксама асобна вяліся картатэкі і інвентарныя кнігі бібліятэкі і архіву. Паводле прыблізных дадзеных на 1942 г. у аддзеле сфрагістыкі і нумізматыкі было зінвентарызавана каля 3 тыс. пазіцыяў, у бібліятэцы – 15. 000. Адносна багаты быў аддзел фатаграфічны, а таксама картаграфічны – яны

[1] Цяпер LNM.

[2] Асобная інвентарная кніга сфрагістыкі не знойдзеная. Вялікі раздзел пячатак ёсць у ІКД-1 (1484–1660) і ІКД-2 (№№ 8049 – 8318).

належалі да архіва і бібліятэкі. Да гэта пары не ведаю, дзе падзеліся і дзе знаходзяцца інвентарныя кнігі і каталогі пералічаных аддзелаў пасля ліквідацыі музею. Як ужо казаў, у музеі сабралася вялікае багацце, болей як палавіна экспанатаў не была з'інвентарызавана – паводле нашага падліку, на дзень ліквідацыі музею ў ім было болей за 50000 экспанатаў, а ў бібліятэцы болей за 25 тыс тамоў кніг. Гэта, паўтараю, вялікае, мільённае багацце беларускага народу.
*БДАМЛМ. Ф. 518. Воп. 1. Адз. зах. 1018. Л. 8–9.*

**Дадатак 2. Пералік інвентарных кніг і каталогаў Музею з абрэвіятурамі і месцамі сучаснага захоўвання.**

1. Архіў LNM. Воп. 3. Адз. зах. 11, 24–29.

2. Інвентарная кніга друкарскіх клішаў (ІКК). №№ 1–2186 // Архіў LNM. Воп. 3. Адз. зах. 11. 834 л.

3. Кніга набыткаў Віленскага беларускага музею ім. Івана Луцкевіча ад 1942 году (КНб). 4. №№ 1–668 // Архіў LNM. Воп. 3. Адз. зах. 24. 24 л.

5. Інвентар Беларускага Музэю ім. Івана Луцкевіча. I. 1–4978. Складзена Антонам Луцкевічам, Пётрам Сергіевічам і Уладасам Дрэмай. (ІКД-1) // Архіў LNM. Воп. 3. Адз. зах. 25. 472 л.

6. Інвентар Беларускага Музэю ім. Івана Луцкевіча. II. 4979–9421. Складзена Уладасам Дрэмай. (ІКД-2) // Архіў LNM. Воп. 3. Адз. зах. 26. 405 л.

7. Кніга рэгістрацыі манет [нумізматыкі, баністыкі і фалерыстыкі] Віленскага беларускага музея. №№1–3164. Складзена Антонам Луцкевічам. (КНм)// Архіў LNM. Воп. 3. Адз. зах. 27. 96 л.

9. Каталог карт бібліятэкі Беларускага музею ім. Івана Луцкевіча ў Вільні. №№1–75. Складзена Уладасам Дрэмай. (КМ) // Архіў LNM. Воп. 3. Адз. зах. 28. 47 л.

10. Кніга дзеля запісу гасьцей Беларускага музею ім I. Луцкевіча ў Вільні. Пачата 24 ліпня 1939 году. Апошні запіс – 07. 12. 1943. (КГ-2) // Архіў LNM. Воп. 3. Адз. зах. 29. 17 л.

11. LMAVB. F21

12. Інвентарная кніга бібліятэкі Беларускага музея імя I. Луцкевіча. Пералік 5427 кніг. Апісанне зроблена У. Дрэмай. 25. 01. 1941 – 19. 04. 1943. (ІКБ) // LMAVB. F21–378. 230 л.

13. Інвентарная кніга (апісанне рукапісаў) Беларускага музея імя I. Луцкевіча ў Вільні, пачата 2. 12. 1935 (фрагмент з № 1 па 59, без канца), пералікі кніг музея, распіскі аб пазыцы кніг і рукапісаў. 1935–1942. // LMAVB. F21–378. 120 л.

14. Кніга запісу гасцей Беларускага музею ім. Івана Луцкевіча. 01. 01. 1932 – 21. 07. 1939. Розныя мовы. (КГ-1) // LMAVB. F21–2049. 103 л.

15. Вопіс старадрукаў і рукапісаў Віленскага беларускага музея. Складзена Уладасам Дрэмай. 07. 05-15. 08. 1944 г. // LMAVB. F. 21–2163.

16. Каталог старадрукаў бібліятэкі Музея, з малюнкамі вадзяных знакаў: Ч. 1. з №№ 1–318; Ч. 2. – №№ 319–411. (КС) Складзены Уладасам Дрэмай. 1943 // LMAVB. F. 21–2309

17. Інвентарная кніга кніг і перыёдыкі бібліятэкі музея імя I. Луцкевіча. Копія (чарнавік) каталога кніг У. Дрэмы. // LMAVB. F. 21–378). [1941–1943]. 99 л.

БДАМЛМ.

18. Інвентарная кніга № 1 прадметаў Музея №№ 1–[2608]. Складзена Антонам Луцкевічам і Пётрай Сергіевічам. З пазнакамі і нумарацыяй У. Дрэмы. 1922–[1941] (ІКЛ-19. // БДАМЛМ. Ф. 518. Воп. 1. Адз. зах. 1128. 278 л.

АРКР ЦНБ НАН

20. Карткавы каталог рукапісаў (РК) // АРКР ЦНБ НАН. Ф. 23. Воп. 1. Адз. зах. 559; LMAVB. F21–379.
21. Карткавы каталог карцін і гравюр (ГК) // АРКР ЦНБ НАН. Ф. 23. Воп. 1. Адз. зах. 558. 186 лл.
22. Карткавы каталог прадметаў (ПК) // АРКР ЦНБ НАН. Ф. 23. Воп. 1. Адз. зах. 560. 206 лл.
23. Літоўскі інстытут літаратуры і фальклору (LTR)
24. Каталог беларускіх народных песень // LTR-2464 (1-906)